# Першы набор

**Кіраўнікоў па ваенна-патрыятычным выхаванні пачнуць рыхтаваць у МДУ імя А.А.Куляшова.**

У Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя А.А.Куляшова абвілі набор на спецыяльнасць "Адукацыя ў галіне фізічнай культуры" з прафілізацыяй "Ваенна-патрыятычнае выхаванне".

Для паступлення абітурыентам неабходна будзе прадаставіць сертыфікаты ЦЭ па рускай або беларускай мове і біялогіі, а таксама здаць унутраны экзамен. Тэрмін навучання складзе 4 гады. За гэты час студэнты змогуць адначасова атрымаць грамадзянскую і ваенна-ўліковую спецыяльнасць.

Першы набор па прафілізацыі "Ваенна-патрыятычнае выхаванне" складзе 20 чалавек.

— На ўведзеную ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі пасаду "кіраўнік па ваенна-патрыятычным выхаванні" цяпер набіраюць спецыялістаў, якія маюць ваенную або педагагічную адукацыю і вопыт ваеннай службы. Адсутнасць профільных спецыялістаў — пакуль нявырашаная праблема. Лічым магчымым адкрыццё новай спецыяльнасці "Адукацыя ў галіне фізічнай культуры. Ваенна-патрыятычнае выхаванне" з унясеннем змяненняў у агульнадзяржаўны класіфікатар і ў Правілы прыёму з правам пераважнага залічэння на навучанне асоб, якія прайшлі службу ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь, — адзначыў першы прарэктар УВА Дзмітрый Лаўрыновіч. — Сёння ў школах існуе патрэба ў ваенруках. Мы хочам рыхтаваць для гэтай дзейнасці кваліфікаваных спецыялістаў, якія змогуць якасна арганізоўваць вучэбны працэс.

**Ганна СІНЬКЕВІЧ.**